ЗАДАЧКА ДЛЯ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ:

як запоўніць бюджэтныя месцы ў ВНУ без пагрозы дэвальвацыі дыплома?

Абмеркаванне Правілаў прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, якое адбылося на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, напэўна, мала каго пакінула абыякавым. Яно і зразумела: уступная кампанія заўсёды мела вялікі палітычны і сацыяльны рэзананс у нашым грамадстве, паколькі закранае інтарэсы не толькі абітурыентаў і іх бацькоў, але і сваякоў, сяброў, школьных настаўнікаў, заказчыкаў кадраў.

— У аснову дзейнага парадку прыёму пакладзены прынцып сацыяльнай справядлівасці і шырокай даступнасці адукацыі, таму сёння нейкіх вострых праблем у арганізацыі прыёмнай кампаніі няма. І ніякіх рэвалюцыйных змен новая рэдакцыя правілаў не змяшчае, — заспакойвае **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.** — Разам з тым з-за дэмаграфіі ў апошнія гады істотна зменшылася колькасць выпускнікоў, што адбілася на забяспечанасці асобных галін эканомікі працоўнымі рэсурсамі. Так, за час дзеяння цяперашніх правілаў прыёму, гэта значыць, з 2006 года, колькасць выпускнікоў базавай школы зменшылася са 147 да 87 тысяч і з 96 да 60 тысяч зменшылася колькасць выпускнікоў сярэдняй школы. А нам вельмі важна раўнамерна забяспечыць кадрамі з прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй усе галіны эканомікі, што неаднаразова зазначаў і Прэзідэнт краіны.

Летась на паказчыках набору ў ВНУ адбілася не толькі дэмаграфічная сітуацыя, але прыярытэты моладзі пры выбары прафесіі, заснаваныя на чаканні будучай матэрыяльнай выгады. Незапоўненымі засталіся ў дзяржаўных ВНУ 2400 бюджэтных месцаў, але, нягледзячы на гэтую акалічнасць, 40 400 абітурыентаў зрабілі выбар на карысць платнай формы навучання. «Відавочна, што для забеспячэння прыярытэтнасці бюджэтнага набору мэтазгодна ўнесці карэктывы ў Правілы прыёму», — падкрэслівае Сяргей Маскевіч.

Так, прапануецца даць магчымасць удзельнічаць у конкурсе па мэтавай падрыхтоўцы ўсім абітурыентам, незалежна ад месца іх пражывання, і павялічыць мэтавы прыём абітурыентаў у ВНУ па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях да 60% ад кантрольных лічбаў прыёму, а па іншых спецыяльнасцях — да 40%.

Ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі мэтавы набор можа быць павялічаны на сельскагаспадарчых і медыцынскіх спецыяльнасцях да 60% і да 30% — па іншых спецыяльнасцях. А вось асобны конкурс для выпускнікоў сельскіх і гарадскіх устаноў адукацыі плануецца адмяніць.

Для таго, каб прыцягнуць здольную моладзь на педагагічныя спецыяльнасці, вырашылі даць магчымасць паступаць туды без іспытаў пераможцам абласнога і мінскага гарадскога этапаў рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, а таксама школьным медалістам і выпускнікам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў з дыпломам з адзнакай. Праўда, для гэтага будучым педагогам трэба будзе атрымаць рэкамендацыю педагагічных саветаў установы адукацыі, якую яны скончылі.

Але, бадай што, галоўная інтрыга заключаецца сёння ў тым, што будуць далей рабіць з ніжняй планкай ЦТ? З-за павышэння ніжняга парога на цэнтралізаваным тэсціраванні летась не змаглі цалкам укамплектавацца не толькі сельскагаспадарчыя, некаторыя тэхнічныя, але і ваенныя спецыяльнасці.

Не пераадолелі ніжні парог тэставага бала, вызначаны для прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай адукацыі, 40 682 чалавекі, або амаль 36% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ. Пасля тэсціравання па матэматыцы з прыёмнай кампаніі выбыў кожны трэці ўдзельнік ЦТ. Яшчэ больш абітурыентаў не вытрымалі іспытаў па фізіцы...

Пераважная колькасць абітурыентаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі здаюць на ЦТ менавіта фізіку і матэматыку. Цікава, а што думае пра ніжні парог на ўступных іспытах яго рэктар?

— Я лічу, што на ўваходзе ў ВНУ павінен быць нейкі бар'ер, які б прымусіў абітурыентаў напружвацца, — падкрэслівае **Міхаіл БАТУРА.** — Але ніжні парог не можа быць агульным для ўсіх. І якраз пра гэта ішла размова на нарадзе. Нельга даводзіць да ўсіх адзіную лічбу: трэба ўлічваць і спецыфіку ВНУ, і попыт на рынку працы на тых ці іншых спецыялістаў, і тую акалічнасць, хто рэальна зможа засвоіць вучэбную праграму, бо не заўсёды і не ўсіх студэнтаў можна «падцягнуць» па школьнай праграме. У нашым універсітэце, нават нягледзячы на павышэнне ніжняга парога на ЦТ, праблем з запаўненнем месцаў не было. І, шчыра кажучы, мы сёлета вельмі задаволены якасным складам нашых першакурснікаў.

Але трэба разумець, што навучацца ў тэхнічнай ВНУ вельмі складана. Я лічу, што ў нас даволі вялікі працэнт адлічэнняў з-за непаспяховасці — за год адлічваецца дзесьці 10% ад агульнай колькасці студэнтаў усіх курсаў. Таму, зніжаючы планку патрабаванняў, трэба разумець, якія наступствы могуць быць у такога рашэння.

А вось на думку **старшыні Савета рэктараў ВНУ, рэктара Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Уладзіміра ШЫМАВА,** нельга вырашаць праблему набору на нейкія спецыяльнасці за кошт рэзкага пагаршэння якасці кантынгенту, які адбіраецца.

— Устаноўлена, што толькі 45—50% ад кожнага школьнага выпуску здольныя эфектыўна асвойваць вучэбныя праграмы вышэйшай школы, — сцвярджае Уладзімір Шымаў. — Існуюць і іншыя эфектыўныя спосабы прыцягнення на не вельмі папулярныя ў абітурыентаў спецыяльнасці. Напрыклад, значнае павелічэнне стыпендыі за кошт зацікаўленых міністэрстваў і рэгіянальных органаў улады, або, напрыклад, стапрацэнтнае забеспячэнне іншагародніх студэнтаў месцамі ў інтэрнатах.

Якім жа будзе рашэнне Міністэрства адукацыі? Да ўступнай кампаніі засталося зусім мала часу. Таму кіраўнік дзяржавы даручыў аператыўна дапрацаваць праект Указа аб зацвярджэнні новай рэдакцыі Правілаў прыёму. А вось вызначэння ніжняга парогавага значэння на цэнтралізаваным тэсціраванні, відаць па ўсім, давядзецца пачакаць...

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Балючая тэма

У ПОШУКАХ «НЕЗЯМНОЙ АСАЛОДЫ»...

...маладыя людзі ўсё часцей трапляюць да псіхіятра ці нават гінуць

Ва ўсіх СМІ Беларусі, у тым ліку і ў нашай газеце, прайшла інфармацыя аб тым, што з пачатку гэтага года ад «марак» з нанесенымі на іх наркотыкамі загінулі 7 маладых чалавек. «На самой справе смерцяў ад гэтага нашмат больш: тыя, што на слыху — гэта кропля ў моры», — лічыць мой суразмоўца. На выгляд Васілю (імя зменена па этычных меркаваннях) ад 18 да 20 гадоў. Худзенькі, спакойны, вельмі бледны (магчыма, ад прыроды)... Сустрэліся мы з ім у РНПЦ псіхічнага здароўя ў Навінках (раней вядомым пад назвай «Рэспубліканская псіхіятрычная бальніца»), дзе Васіль цяпер праходзіць лячэнне.

«Падмануць бацькоў нескладана...»

Нягледзячы на юны ўзрост, Васіль паспеў пакаштаваць і «легендарны ЛСД», і спайс, і «маркі». Купіць усё гэта, кажа хлопец, вельмі лёгка.

— Мне таксама прададуць? — недаверліва пытаюся я.

— Прададуць, — упэўнена адказвае Васіль...

Прадаўцоў, па словах Васіля, у інтэрнэце вельмі шмат, толькі ў Мінску чалавек 100-150. Заходзіш да любога на сайт або ў «Скайп» і пішаш, што табе трэба. Табе дадуць нумар інтэрнэт-кашалька, на які трэба пералічыць грошы. І літаральна праз паўгадзіны пасля іх пералічэння прыходзіць адрас, дзе можна знайсці «закладку» з дэталёвым апісаннем месца: нешта накшталт «каля трэцяга пад'езда да дна сметніцы будзе прыляплены двухбаковым скотчам пакецік»...

Вылічыць прадаўца пры гэтым практычна немагчыма.

— Часам могуць і падмануць: ты пералічыў грошы, але нічога не атрымаў. Тут 50 на 50, — уступае ў размову Алена, яшчэ адна пацыентка (у яе падобная праблема: «падсела» на спайс).

У 2013 годзе праз таксікалагічныя аддзяленні Мінска прайшлі 380 пацыентаў з вострым псіхозам пасля ўжывання сінтэтычных наркотыкаў. Толькі за студзень 2014 года такіх выпадкаў было 37, а за люты — ужо 81. 10-15% з іх прыпадае на школьнікаў, 50% — на людзей да 25 гадоў.

Васіль кажа, што нават ЛСД (вельмі моцны галюцынаген) дзейнічае слабей, чым «маркі».

— Адбываецца поўная страта кантролю. Дзеянне праяўляецца не імгненна, а развіваецца на працягу гадзіны. Глядзіш на звычайную сцяну, — і раптам нейкі яе ўчастак пачынае торгацца. Потым другі, трэці... А далей надыходзіць хаос. Усё вакол скача, з'яўляюцца чэрці... Ва ўсіх па-рознаму, вядома. Напэўна, што ў каго ў галаве, тое і адбываецца. Доўжыцца гэта 6-8 гадзін, а потым паступова дзеянне наркотыку праходзіць. Але пасля гэтага я доўга не мог спаць, хоць быў увесь, як выціснуты лімон...

— Я спрабаваў «маркі» чатыры разы, — працягвае Васіль. — Першыя тры разы мне спадабалася. А ў апошні было вельмі страшна. Пачалася сапраўдная параноя: мне здавалася, што за мной сочаць. Калі насустрач ішоў чалавек і гаварыў па тэлефоне, я быў упэўнены, што ён гаворыць пра мяне і сочыць за мной. Хтосьці паглядзеў на мяне — тыя ж самыя думкі... Я быў упэўнены, што я ў сур'ёзнай небяспецы.

Бацькі сталі заўважаць, што ў мяне апухлы твар, чырвоныя вочы, невыразная гаворка. Занепакоіліся, пачалі высвятляць, у чым справа. Але я ні ў чым не прызнаваўся. Казаў, што стаміўся на занятках або што выпіў піва... Але паху алкаголю ад мяне не было, і мама ўрэшце забіла трывогу і палезла ў інтэрнэт. Там прачытала пра розныя сімптомы, стала высвятляць праўду, і я нарэшце «раскалоўся»...

Тым не менш Васіль упэўнены, што ў большасці выпадкаў падмануць бацькоў нескладана, і падлеткі і моладзь гэтым карыстаюцца.

❍❍❍

Алена, якая сядзіць побач, згодна ківае галавой. І кажа, што купіць спайс таксама не праблема.

— Тэлефануеш па названым на сайце нумары. Потым пад'язджаеш у названы час да згаданага месца. Стаіць хлопец, сам абкураны, ледзь на нагах трымаецца, а да яго натуральная чарга... Ці раней у машынах сядзелі. Адчыняюць акно — а з яго «кумар» валіць. Да машыны таксама чарга была...

У гэтай чарзе, як кажа Алена, можна было сустрэць самых розных людзей, не абавязкова моладзь. Былі і 30-35-гадовыя, можна было ўбачыць нават людзей ва ўзросце, якія з кавенькамі прыходзілі. Шмат было таксістаў — яны прыязджалі не проста па адну порцыю, а па партыю.

— Я чула, што ёсць сайт — не памятаю, як называецца... (у абаіх я заўважыла гэты выраз, які раз-пораз паўтараўся). Там можна заказаць любы наркотык...

«Маркі» Лена ўжываць не спрабавала.

— Я чула розныя гісторыі. Хтосьці распавядаў, што можа пасля іх увайсці ў свой уласны мозг і пагуляць там, а потым выйсці. Мяне гэта не натхніла. Да таго ж у мяне ёсць знаёмы, які пасля «маркі» два дні не мог адысці. Потым яшчэ месяц лячыўся ў псіхіятра — усяго толькі пасля адной «маркі»...

Людзі ўжываюць «ката ў мяшку»

Спецыялістаў палохае нарастальная папулярнасць сінтэтычных наркотыкаў і няўхільныя наступствы іх ужывання.

— У нашы аддзяленні людзі пасля ўжывання спайсу пачалі паступаць два гады таму, — расказвае **нарколаг, загадчык рэабілітацыйнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Уладзімір ІВАНОЎ.** — Раней іх не было. І тое, што мы назіраем за гэтыя два гады ад курэння спайсаў — гэта шызафрэнападобныя і параноідныя псіхозы з трызненнем і галюцынацыямі. Тыповым з'яўляецца трызненне пераследу, калі людзі лічаць, што нехта за імі сочыць і вось-вось іх схопіць. Больш выяўленыя расстройствы адносяцца да шызафрэнападобнага псіхозу, калі людзям здаецца, што яны пачынаюць кіраваць падзеямі планетарнага маштабу, уплываць на касмічныя целы, вялікія масы людзей і г.д. Такія пацыенты трапляюць, як правіла, у псіхіятрычныя аддзяленні закрытага тыпу.

Для таго, каб наступіла залежнасць, часам бывае дастаткова ўсяго некалькі разоў пакурыць спайс. Некаторым патрабуецца крыху большы тэрмін — месяц-два, пасля гэтага яны пераходзяць ад эпізадычнага курэння да сістэмнага — кожны ці амаль кожны дзень. А заканчваецца ўсё тым, што яны некалькі дзён запар могуць курыць па 10-15 разоў на суткі і цалкам выключаюць сябе з жыцця. Звычайна гэта адбываецца дзесьці праз год пасля пачатку такога курэння.

❍❍❍

— Што тычыцца «марак», то мы пакуль нават не ведаем, мікрадозы якіх рэчываў на іх наносяць, — дзеліцца спецыяліст. — Фактычна людзі ўжываюць «ката ў мяшку». Сёння наркалабараторыі вырабляюць вельмі шмат мадыфікацый псіхаактыўных рэчываў, і для кожнай мадыфікацыі медыкам трэба шукаць прыдатныя рэактывы, падбіраць пэўныя методыкі вызначэння іх наяўнасці ў арганізме. Гэта складана.

(Цяпер спецыялісты сыходзяцца ў адным: усе канфіскаваныя «маркі» былі выраблены саматужным спосабам. Разлічыць дакладна дазіроўку ў хатніх умовах немагчыма. Так, на дзвюх «марках», якія канфіскавалі праваахоўнікі, канцэнтрацыя небяспечнага рэчыва адрознівалася аж у 10 разоў! Гэта значыць, пры кожным ужыванні ёсць небяспека памерці. — **Рэд**.).

«Маркі», па словах Уладзіміра Іванова, даюць ап'яненне, вельмі падобнае на ЛСД-25. Дарэчы, і спосаб транспартавання, і ўжывання наркотыку тут аднолькавы.

— Упершыню ЛСД, нанесены на паштовую марку, з'явіўся ў 1960-х гадах. Каб выклікаць стан наркатычнага ап'янення, патрабуецца вельмі мала гэтага рэчыва, а перадазіроўка яго вельмі небяспечная. Таму мікраграмы ЛСД цітравалі і наносілі на марку, і потым злізвалі языком, — гаворыць нарколаг. — Наступствы ад прыёму ЛСД непрадказальныя. Мізэрная яго доза можа паглыбіць у наркатычныя галюцынацыі на 12 і больш гадзін, пры гэтым чалавек можа адчуваць як незямную «асалоду», так і найвялікшы жах. Менавіта пасля выкарыстання ЛСД былі апісаны выпадкі смерцяў, калі ў стане наркатычнага ап'янення і выкліканага гэтым псіхозу людзі адчувалі сябе ўсемагутнымі, у тым ліку думалі, што ўмеюць лётаць, і выскоквалі з вокнаў.

Цяпер усё тое ж самае, толькі выкарыстоўваюцца іншыя псіхатропныя рэчывы. Яны выклікаюць парушэнні свядомасці і грубыя расстройствы псіхічнай дзейнасці. Магчымыя параналдальныя псіхозы. Каб выратаваць жыццё чалавека, задзейнічаюцца таксіколагі, рэаніматолагі.

— Але гэта не асноўнае пытанне, — лічыць спецыяліст. — Медыкі не маюць ніякага дачынення да вытворчасці і распаўсюджвання псіхаактыўных рэчываў. А менавіта ў гэтым і заключаецца сутнасць праблемы. Дактары змагаюцца толькі з наступствамі. Таму мы будзем лячыць пацыентаў, якія будуць да нас паступаць. Але змагацца з праблемай трэба ўсяму грамадству. Тут патрэбны комплексныя падыходы.

Святлана БУСЬКО

■

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Спайс — курыльная сумесь, апрацаваная тым ці іншым сінтэтычным наркатычным рэчывам. Спайсы ў Беларусі забаронены да распаўсюджвання.

«Марка» — папяровы квадрацік, на які нанесены сінтэтычны наркотык. Гэтыя паперкі кладуць у рот, у выніку чаго наркотык трапляе спачатку ў сліну, а затым — у кроў.

І спайс, і «марка» могуць выклікаць непрадказальныя рэакцыі арганізма: затарможанасць, страту прытомнасці, псіхозы, пачуццё страху ці галюцынацыі, падчас якіх чалавек здзяйсняе некантраляваныя ўчынкі. У некаторых выпадках наступае смерць.